


*За апошнія 10 гадоў з актыўным удзелам Захавальнікаў балота Ельня было пабудавана каля 60 плацін для аднаўлення гідралагічнага рэжыму*



# Мы – Захавальнікі ТВП "Балота Ельня"!



*Валерый Кавалёнак*

*Дзмітрый Шокель*

*Андрэй Шокель*

**Дзейнічайце разам з намі для захавання прыроды Беларусі!**

Калі Вы жывяце каля балота Ельня ці маеце магчымасць наведваць яго, Вы можаце стаць Захавальнікам ТВП "Балота Ельня" і дапамагчы зберагчы яе для нашчадкаў.

Удзельнічайце ў захаванні ТВП "Балота Ельня", паведамляйце пра пагрозы і свае назіранні супрацоўнікам АПБ, заказніка, прыродаахоўных інспекцый.

## Як далучыцца да нас?

**Заходзьце на старонку**

www.iba.ptushki.org

**або тэлефануйце:**

**8 (017) 263-06-13, 8 (02152) 4-12-37**

**ГА "Ахова птушак Бацькаўшчыны"**

8 (017) 263-06-13,
8 (029) 223-06-13,
8 (029) 101-68-87
www.ptushki.org
info@ptushki.org
www.vk.com.ptushki
www.fb.com/APB.BirdLife.Belarus

**Заказнік "Ельня"**
г. Міёры

тел/факс: 8 (02152) 4-12-37
yelnya@tut.by
www.fb.com/yelnya.reserve
www.zakazniki.priroda-vitebsk.by

Здымкі: В. Кавалёнак, В. Лукшыц, С. Плыткевіч, В. Фянчук, P. Parkkinen

Праект DCI-NSAPVD/2012/292081 "Прырода важна для ўсіх. Умацаванне аховы прыроды праз развіццё лідэрства і ўдзел мясцовага насельніцтва ў працэсе прыняцця рашэнняў на мясцовым узроўні" рэалізуецца ГА "Ахова птушак Бацькаўшчыны" пры фінансавай падтрымцы Еўрапейскага Саюза. За змест выдання адказвае ГА "Ахова птушак Бацькаўшчыны"

ООО «РИФТУР ПРИНТ» Свидетельство о ГРИИРПИ № 1/284 от 09.04.2014 г. Типография УП «Джи энд Ди» Свидетельство о ГРИИРПИ № 2/36 от 13.01.2014 г. Тираж 2000 экз. Заказ 410

Грамадская арганізацыя
**"Ахова птушак Бацькаўшчыны"**
www.ptushki.org

Тэрыторыя, важная для птушак

# БАЛОТА ЕЛЬНЯ



Праект фінансуецца ЕС

BirdLife IBA ТЭРЫТОРЫЯ ВАЖНАЯ ДЛЯ ПТУШАК



## Што такое ТВП?

Эфектыўным метадам аховы многіх відаў жывёл і раслін з'яўляецца захаванне прыродных тэрыторый, неабходных для іх існавання. Адзін з падыходаў – гэта выдзяленне ў адпаведнасці з пэўнымі крытэрыямі Тэрыторый, важных для птушак (ТВП), якія забяспечваюць выжыванне папуляцый большасці відаў птушак. Гэта месцы гнездавання, зімоўкі ці міграцыйныя шляхі тых відаў птушак, якія маюць неспрыяльны ахоўны статус або знаходзяцца пад пагрозай знікнення.

Сусветная праграма ТВП ахоплівае 200 краін, больш за 12 000 тэрыторый, з якіх 51 знаходзіцца ў Беларусі.

Тэрыторыя ТВП "Балота Ельня" мае высокі статус водна-балотнага ўгоддзя міжнароднага значэння (Рамсарская тэрыторыя), а таксама ландшафтнага заказніка рэспубліканскага значэння.

**Карта Тэрыторый, важных для птушак Беларусі**




## Цікавыя факты пра ТВП "Балота Ельня"

**1** Ельня – адно з найбуйнейшых махавых балот Еўропы, яго ўзрост – каля 9000 гадоў.

**2** Балотны комплекс адметны вялікай колькасцю рэк і азёр. Тут налічваецца 118 азёр, а возера Ельня – найбуйнейшае на махавых балотах Беларусі (5,4 км$^2$).

**3** Больш чым 6000 шэрых жураўоў падчас восеньскай міграцыі спыняюцца на Ельні на некалькі тыдняў для адпачынку.



Шэрыя жураўы

**4** Чорнаваллёвы гагач нездарма адлюстраваны на лагатыпе заказніка "Ельня" – тут самая высокая колькасць гагачоў на гнездаванні ў Беларусі.



Гагач

**5** Белая пардва – галоўная прыгажуня балота Ельня. Гэта амаль адзінае месца ў Беларусі, дзе яшчэ захаваліся незвычайныя птушкі, якія змяняюць колер пёраў у залежнасці ад пары года. Прывабна Ельня і для іншых цецеруковых, тут існуе некалькі такавішчаў цецерукоў.

Цецярук



Белая пардва



## Што пагражае ТВП "Балота Ельня"?

- Парушаны гідралагічны рэжым у выніку дрэнажнай дзейнасці каналаў, што вядзе да асушэння балота і высокай рызыкі пажараў.
- Пажары, асабліва згубныя вясной і летам, калі гінуць кладкі і птушаняты. Найбольш адчувальныя страты могуць быць для пардвы і рэдкіх відаў кулікоў з-за іх нешматлікасці.



- Незаконны лоў рыбы стаўнымі сеткамі на азёрах балота, у якія трапляюць і гінуць чорнавалёвыя гагачы, гогалі і іншыя ныркавыя качкі.
- Турбаванне птушак падчас гнездавання, перш за ўсё аматарамі-рыбаловамі, якія наведваюць балотныя азёры ў красавіку – чэрвені. Асабліва шкодна, калі яны прыходзяць з сабакамі. Вельмі адчувальныя да прысутнасці чалавека чорнавалёвыя гагачы, якія будуюць гнёзды на берагах азёр.
- Выкарыстанне тэхнікі, якая пашкоджвае расліннае покрыва, пакідае глыбокія каляіны, што зарастаюць вельмі марудна. У гнездавы сезон пад коламі гінуць гнёзды і нялётныя птушаняты.

